# **Дзясяты** сшытак

**V галерэі "Лабірынт" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі прэзентавалі серыю нотных выданняў "Музычная спадчына Рэчы Паспалітай з Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі".**

Серыя нотных выданняў была заснавана ў 2008 годзе кампазітарам і даследчыкам, дацэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Яўгенам Паплаўскім. На'сённяшні дзень выйшла 10 сшыткаў.

Выпуск серыі "Музычная спадчына Рэчы Паспалітай з Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі" — гэта спроба пазнаёміць усіх зацікаўленых з музычнай культурай Рэчы Паспалітай, дакрануцца да найцікавейшага помніка культуры XVII — пачатку XVIII ст. "Давыдкаўскага ірмалагіёна"... Выданне — сумесны праект Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, аднаго з айчынных прыватных выдавецтваў, Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі, Польскага інстытута ў Санкт-Пецярбургу.

**Ул.інф.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ